**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа Ельскага раёна”**

Распрацавана і праведзена
настаўнікам пачатковых класаў Любінай
Аленай Аляксандраўнай
дзяржаўнай установы адукацыі
“Рамязоўскі яслі-сад-сярэдняя школа
Ельскага раёна”

## Вусны часопіс “Беларусь – мая Радзіма”

**Мэта:**

- абагульніць веды аб дзяржаўных і культурных сімвалах Рэспублікі Беларусь;
- стварыць умовы для развіцця памяці, мыслення, звязнай вуснай мовы дзяцей;
- спрыяць выхаванню культуры вуснага маўлення, патрыятызму.

**Абсталяванне:** фотаздымкі, малюнкі вучняў па тэме: “Беларусь”, аўдыёзапісы беларускіх песень.

### Ход мерапрыемства

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап**

\- Міласці просім кожнага ў госці,
Вусны часопіс чакае гасцей,
Заходзьце, заходзьце хутчэй!

**Гульня “Вітанне”**

\- Давайце павітаемся.
Добрае ранне сонцу (рукі ўгару – да сонца)
І птушкам (махі рукамі).
Добрае ранне сынам і дачушкам (гладзяць сябе).
Добрае ранне добрым усім людзям (паказваюць адзін на аднаго).
Шчыра вітацца мы не забудзем (усміхаюцца адно аднаму).
Сонечны дзень з намі павітаўся (усміхаюцца).
Сядзем усе мы (садзяцца).
Настрой наш узняўся!

**II. Этап пастаноўкі тэмы і мэты мерапрыемства**

\- Пра што мы будзем сёння гаварыць?

\- Сёння нас чакае цудоўнае падарожжа – падарожжа па сваёй краіне. А як яна завецца?

\- Куточак зямлі, дзе бярозкі шумяць,
Дзе ясныя зоркі ў азёры глядзяць,

Дзе клёкат бусліны нам песняй гучыць.
Куточак зямлі, як цябе не любіць!
Куточак зямлі, на якой мы жывём,
Ласкава цябе Беларуссю завём!

**III. Этап правядзення мерапрымства**

**1 старонка “Мая Радзіма – Беларусь”.**

- А як называецца наша Радзіма ў афіцыйных абставінах?
- А яшчэ Рэспубліка Беларусь – унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.
- Унітарная – адзіная, не мае ўнутры сваіх межаў іншых дзяржаў.
- Дэмакратычная – дзяржава пабудаваная на прызнанні таго, што ўлада належыць народу і ўсе грамадзяне свабодныя і раўнапраўныя. Народ ажыццяўляе ўладу праз сваіх прадстаўнікоў – дэпутатаў ці непасрэдна – усеагульным галасаваннем (на рэферэндуме). Для выражэння сваёй волі грамадзяне могуць утвараць палітычныя партыі і грамадскія аб’яднанні.
- Сацыяльная – нясе адказнасць за грамадства ў цэлым і за годнае існаванне ў ім кожнага чалавека.
- Прававая – дзяржава, у якой прыняты і дзейнічае асноўны закон (Канстытуцыя РБ). Гэта вельмі важны дакумент для ўсіх людзей, якія жывуць у Беларусі.
- Рэспубліка Беларусь – развітая суверэнная дзяржава, якая абараняе сваю незалежнасць і самастойна вырашае пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі.

**2 старонка “Віктарына “Мой родны кут”.**

1. Калі адзначаецца Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? (15 сакавіка).
2. Калі адзначаецца Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь? (3 ліпеня).
3. Які асноўны закон Рэспублікі Беларусь? (Канстытуцыя).
4. З якімі дзяржавамі мяжуе Рэспубліка Беларусь? (Расія, Латвія, Літва, Эстонія, Польшча).
5. На колькі абласцей падзелена Рэспубліка Беларусь? (6 абласцей)
6. Назавіце сталіцу Рэспублікі Беларусь (Мінск).
7. Якія дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь? (герб, сцяг, гімн)
8. Калі адзначаецца Дзень дзяржаўнага Герба і Сцяга? (першая нядзеля мая).

Я родным краем ганаруся
І ведаю – я не адзін
Я – грамадзянін Беларусі,
Зямлі сваёй адданы сын.
Усё, што тут, - маё па праву.
Свой лёс з Айчынаю дзялю.
Я нашу родную дзяржаву,
Як маці мілую люблю.
І пашпарт беражна трымаю,
Як пропуск у шчаслівы дзень,
І над маім жыццём лунае

Надзеі радасны прамень.
- У каго з вас ёсць пашпарт?
- Кожны чалавек, у якога ёсць пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, знаходзіцца пад абаронай Рэспублікі Беларусь.

**3 старонка “Мы – беларусы”.**

- Ты хто?

Украінец?
Малдаванін?
Мо кубінец?
Англічанін?
Ці француз?
Не, няпраўда, беларус!

- Наша краіна размешчана ў цэнтры Еўропы. Займае тэрыторыю плошчай 207,6 тыс. кв. км. Праехаць праз усю Беларусь на аўтамабілі можна за 6-7 гадзін. Яе працягласць з поўдня на поўнач – 560 км, з захаду на усход – 650 км. Сталіца Беларусі – горад Мінск. Наша тэрыторыя падзяляецца на вобласці. Іх шэсць.

Мінская вобласць – насельніцтва 1417, 3 тыс. чалавек. Абласны цэнтр – Мінск. Насельніцтва – 1959,7 тыс. чалавек. Вялікія гарады – Барысаў, Салігорск, Маладзечна, Слуцк, Жодзіна. Знакамітыя прадпрыемствы: “Атлант”, “Керамін”, “Мілавіца”, “Камунарка”, Парк высокіх тэхналогій.

- Брэсцкая вобласць – заходнія вароты Беларусі – мяжуе з Польшчай, Украінай. Тут пражывае 1,4 млн чалавек. Вялікія гарады – Брэст, Баранавічы, Пінск. Знакамітая ва ўсім свеце – Белавежская Пушча.
- Віцебская вобласць – паўночная частка краіны, мяжуе з Расіяй, Латвіяй, Літвой. Пражывае тут 1,2 млн. чал. Вялікія гарады – Віцебск, Орша, Полацк, Наваполацк. Тут знаходзіцца самы вялікі валун у Беларусі. Яго даўжыня 11 м, шырыня – 5, 6 м, вышыня – 2,8 м. Праводзіцца штогод фестываль “Славянскі базар”.
- Гомельская вобласць – размяшчаецца на паўднёвым усходзе – мяжуе з Украінай і Расіяй. Насельніцтва – 1422,9 тыс. чалавек. Буйныя гарады – Гомель, Мазыр, Рэчыца, Светлагорск, Жлобін. Гэта беларускае Палессе.
- Гродненская вобласць мяжуе з Польшчай і Літвой. Насельніцтва – 1050,1 тыс. чалавек. Вялікія гарады – Гродна, Ліда, Слонім, Ваўкавыск, Смаргонь, Навагрудак. Буйныя лясныя масівы: Налібокская, Ліпічанская, Графская пушча, нацыянальныя паркі “Нарачанскі”, “Белавежская Пушча”. Тут размяшчаецца Аўгустоўскі канал, старажытныя абарончыя збудаванні: Лідскі замак, Мірскі замак, Навагрудскі замак, царква-крэпасць у Сынковічах, Успенскі мужчынскі манастыр у Жыровічах.
- Магілёўская – усходні рэгіён – мяжуе з Расіяй. Тэрыторыя – 1067, 6 тыс.чалавек. Буйныя гарады – Магілёў, Бабруйск. Тут вырабляюць ліфты, падземныя аўтапаязды. Праводзіцца Міжнародны музычны фестываль “Залаты шлягер”, фестываль духоўных музыкі і спеваў “Магутны Божа”.
- Вобласці падзяляюцца на раёны:

Мінская – 22 раёны
Віцебская – 21 раён
Гомельская – 21 раён
Гродненская – 17 раёнаў
Магілёўская – 21 раён.

- Раёны падзяляюцца на гарады і сельскія саветы.
- Наступны наш конкурс звязаны з той інфармацыяй, якую вы праслухалі.

1. Якая самая вялікая па колькасці насельніцтва вобласць Беларусі? (Мінская)
2. Які горад з'яўляецца адначасова абласным цэнтрам і галоўным горадам краіны? (Мінск)
3. Самая паўночная вобласць (Віцебская вобласць).
4. Заходнія вароты Рэспублікі Беларусь (Брэсцкая вобласць).
5. Дзе знаходзіцца Белавежская Пушча? (у Брэсцкай і Гродненскай абласцях)
6. Дзе вырабляюць ліфты? (у Магілёве)

**4 старонка "Родная мова".**

- Многа моў на гэтым свеце,
  Многа слоў у яго букеце,
  Многа думак, многа згадак,
  Многа гукаў і загадак.
  Але ёсць адна такая:
  Словы ў ёй нібы звіняць.
  Трэл, гукі разліваюць
  І ляцяць, ляцяць, ляцяць…

**Конкурс "Знаўцы мовы"**

***1. "З горкі на горку"***

А ка вёр па чык
вёс ва ка лет

***2. "Аднавіце слова"***

ладжа – джала
джайура – ураджай
сыджын – джынсы
гліджун – джунглі

***3. Знайдзіце словы, якія схаваліся***

Боршч – бор
Бальніца – баль
Бручка – ручка
Бутон – тон

***4. Закончыце прыказкі.***

Чалавек без працы…..
Новых сяброў набывай, а ….
Як дбаеш, так і …..

***5. Назавіце адным словам:***

Вучань першага класа.
Той, хто вучыцца або вучыўся ў адным класе.
Той, хто працуе на будаўніцтве.
Той, хто займаецца пчалярствам.

6. ***Назавіце словы з супрацьлеглым значэннем.***

Дзень, смех, белы, халодны, павольна.

7. ***Устаўце галосныя так, каб атрымаліся назвы беларускіх гарадоў.***

Г..м..ль ..шм..н.. Д..бр..ш Жл..б..н
Р..ч..ц.. Н..св..ж

8. ***Замяніце фразеалагізмы словамі, блізкімі па сэнсе.***

Падаць рукой – блізка, абуць у лапці – хлусіць, пускаць туман у вочы - падмануць, быць на сёмым небе – радавацца.

9. ***Гульня “Збегла слова”.***

Бусел корміцца …
Па галінцы паўзе паласаты …
Дзік шукае пад дубам …
Зіне падарылі каляровыя …
На небе ззяюць …
Паспелі чырвоныя і чорныя …

**5 старонка “Дзяржаўная ўлада”.**

- Дзяржаўная ўлада падзелена на тры галіны: заканадаўчую, выканаўчую і судовую.
- Заканадаўчая адказвае за стварэнне законаў – Парламент, дэпутаты, Нацыянальны сход.
- Выканаўчая выконвае законы – Урад, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія міністэрствы, дзяржаўныя камітэты Рэспублікі Беларусь, мясцовыя – абласныя, раённыя, гарадскія, пасялковыя і сельскія выканаўчыя камітэты, мясцовыя адміністрацыі.
- Судовая ўлада прадстаўлена судамі.
- Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь выбіраецца на 5 гадоў, валодае недатыкальнасцю. Першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь быў выбраны ў 1994 годзе. Хто гэта быў?

**6 старонка “Прырода роднага краю”**

Край балот,
Нізін, азёраў наскіх,
Край лясоў,
Маўклівых сосен – струн…
Край паэм,
Адвечных песень-казак.
Дарагая сэрцу
Беларусь…

**Віктарына “Прырода роднага краю”**

1. Возера, якое называецца “беларускім морам” (Нарач).
2. Самыя вялікія рэкі Беларусі (Днепр, Заходняя Дзвіна, Нёман, Прыпяць,

Сож).

3. Найстаражытнейшы ў Беларусі запаведнік (Белавежская Пушча).
4. Цар пушчанскіх звяроў (зубр).
5. Вечназялёныя дрэвы (елка, сасна).
6. Буйная жывёла з галінастымі рагамі і ганарліваю хадою (лось).
7. Дрэва, якое жыве каля тысячы гадоў (дуб).
8. Кветкі, уплеценыя ў вянок з каласоў на беларускім гербе (канюшына і лён).
9. Птушка – сімвал Беларусі (бусел).
10. Птушка – сімвал 2018 года (чорнагаловы стрыж).
11. Якія дрэвы даюць салодкі сок? (клён, бяроза)
12. Кара якога дрэва ядавітая? (чаромхі)
13. Якое дрэва можна назваць самым баязлівым? (асіну)
14. З якога дрэва летам "ідзе снег"? (з таполі)
15. Кветкі якога дрэва дапамагаюць лячыць прастуду? (ліпы)
16. Ліст якога дрэва адлюстраваны на сцягу Канады? (клён)
17. Якое дрэва называюць "плаксай"? (іву)
18. Якое хвойнае дрэва скідвае сваю ігліцу, як і лістцевыя дрэвы? (лістоўніца).

**IV. Этап падвядзення вынікаў мерапрыемства**

Радзіме – за мір,
За жыццё – сваёй маці,
Птушцы – за спеў,
За дах – роднай хаце,
Полю – за хлеб, што
Ляжыць на стале,
Сонцу – за свет, за цяпло на Зямлі,
Ночцы – за сон, што дае адпачыць,
Школе, сябрам – што цікава так жыць!
Вас толькі прашу я, сябры, не забудзьце –
Заўсёды і ўсюды ўдзячнымі будзьце!

-Я дзякую ўсім за ўдзел у конкурсах. Наш вусны часопіс прачытаны. Спадабалася вам быць чытачамі? Да новых сустрэч, сябры!